# Дысцыпліна “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”, як аснова падрыхтоўкі спецыялістаў вайсковых спецыяльнасцей.

УДК 378.6
Поляк Н.А. к. г. н., дацэнт
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт*

Нацыя- і дзяржаватворчыя працэсы на землях Беларусі ўвесь час, пачынаючы, XIX ст., з’яўляюцца тэмай шматлікіх навуковых артыкулаў і разнастайных даследчыцкіх прац. Але імкненне разгляду усёй гісторыі нашай краіны праз прызму станаўлення і развіцця дзяржаўнасці, паўстала толькі зараз. Дадзеная ідэя перарасла і аформілася ў новую канцэпцыю выкладання дысцыплін гуманітарнага блоку ў ВНУ краіны, дзе пачэснае месца заняў абавязковы для вывучэння курс “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”. У гэтай сувязі паўстае заканамернае пытанне аб значнасці і мэтазгоднасці дадзенай дысцыпліны для падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшага ўзроўню. Такім чынам, актуальнасць дадзенага артыкула з’яўляецца відавочнай.

Гістарыяграфія беларускай дзяржаўнасці прадстаўляе сабой эпізадычныя даследаванні гісторыкаў, якія разглядалі або толькі пэўныя этапы станаўлення, фарміравання і развіцця дзяржавы ў беларусаў, або толькі яе асобныя элементы (улада, палітыка, войска, права, этнагінез і г.д.). Сярод такіх прац канца XX пачатку XXI ст. можна назваць даследванні суайчыннікаў: Сташкевіча М. [9], Бохан Ю. [2], Стрэнкоўскі С.П. [10], Юхо [11], Вішнеўскі, А. Ф. [3], Доўнар, Т. І. [4], Аргучынцэў Г.К. [1], Латышонак А. [8] і інш.

У пачатку нашага стагоддзя пабачыла свет аглядная праца “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” ў 2 кнігах [5], якая ад іншых агляднных выданняў адрознівалася толькі назвай. Акцэнт у её зроблены на выкладку вялікай колькасці фактаў грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі ад стражытнасці да нашых дзён.

Фундаментальнай і канцэптуальна іншай з’явілася праца калектыва аўтараў Акадэміі Навук Беларусі пад назвай «История белорусской государственности» [6]. Дзве кнігі з пяці пабачылі свет у гэтым і мінулым годзе. Самая галоўная адметнасць гэтай працы ў трактоўкі беларускай гісторыі з пункту гледжання самастойнай пабудовы ўласнай дзяржаўнасці. Багатая доказная база і вялікая ўвага да дзяржаватворчых працэсаў робіць выданне выключным і прынцыпова новым. Менавіта яно і ёсць, як адзначылі самі аўтары “уласны беларускі погляд на нашу дзяржаўнасць… Гэта праца даўно была патрэбна нашай краіне і нашаму народу”. Пададзены ў шматтомніку матэрыял з’явіцца асновай для дэталёвай распрацоўкі плануемага навучальнага курса для ВНУ.

Асноўная мэта плануемай дысцыпліны “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”, вельмі значная і ў многім адрозніваецца ад школьнага курса “Гісторыя Беларусі”. Сёння моладзь дастаткова добра вывучыла асноўныя факты і падзеі нашай мінуўшчыны і патрабуе большага. Веды па гісторыі

беларускай дзяржаўнасці дазволяць дасканала фарміраваць гістарычны светапогляд нашага этнасу і шырэй глядзець на сваё месца ў еўрапейскай палітыцы з акцэнтам на ўласны падыход. Ад трансляцыі факталагічнага матэрыялу адбываецца пераход да разумення сутнасці гістарычных падзей, усведамлення значнасці і своеасаблівасці палітычных, эканамічных і культурных працэсаў, разгляду эвалюцыі розных паняццяў і з'яў. Глыбокае асэнсаванне іх адметнасці дапамагае вызначыць перспектывы будучыні нашай краіны. Сярод іншага, новы навучальны курс дае матэрыял для ўмацавання нацыянальнай ідэі і з'яўляецца фундаментам дзяржаўнай ідэалогіі. Нацыянальная ідэя – гэта нацыянальныя героі (у шольшасці вайскоўцы), даты нацыянальнага гонару (грандыёзныя перамогі, войны) і нацыянальныя сімвалы. Беларуская дзяржаўнасць і ёсць элемент нацыянальнай ідэі, нацыянальная каштоўнасць, якую ствараў і ўмацоўвае сам народ. Гартаванне нацыянальнай ідэі – гэта шлях да вырашэння некаторых прыкладных задач сучаснай Беларусі. Навучанне вайсковай моладзі ў рэчышчы новай канцэпцыі гуманітарнай адукацыі, дазволіць рыхтаваць кадры, якія возьмуць на сябе адказнасць за інфармацыйную бяспеку краіны (Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь зацверджана Саветам бяспекі Рэспублікі Беларусь ад 19.03.2019 г.). Растаўленыя, згодна з нацынальнымі і дзяржаўнымі інтарэсамі, прыярытэты дапамогуць маладому пакаленню вайскоўцаў прафесійна адказваць на пагрозы ў тым ліку і на інфармацыйнай прасторы.

Вывучэнне гісторыі беларускай дзяржаўнасці пачынаецца літэральна са з'яўлення людзей на тэрыторыі Беларусі і фарміравання так званых гістарычных, данацыянальных форм дзяржаўнасці – першых княстваў – Полацкага, Тураўскага, Смаленскага. Далей вылучаюцца этапы ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі і г.д. Каштоўным з'яўляецца тое, што тэматычны матэрыял новага курса пабудаваны з улікам новых навуковых адкрыццяў, знойдзеных у апошні час археалагічных матэрыялаў, перапрацаваных дакументаў, адшуканых крыніц.

Пачэснае месца ў новым курсе займаюць вызначэнні паняццяў і іх эвалюцыя. Так, напрыклад, тэрміны “зямля”, “гаспадарства” “княства” праходзячы асноўныя этапы развіцця ператвараюцца ў “дзяржаву” ці “дзяржаўнасць” у яе гістарычнай і далей нацыянальнай форме. Падаецца сутнасць гістарычнай трансфармацыі паняццяў “улада”, “інстытуты ўлады”, “нацыянальна прававая сістэма”, “дзяржаватворчыя і нацыятворчыя працэсы” і інш.

Тэрмін “дзяржава” мае некалькі канцэптуальна розных вызначэнняў. Так, напрыклад, гэта палітычная форма арганізацыі грамадства, заснаваная на публічнай уладзе, цэнтралізаваным кіраванні грамадствам і манаполіі на прымяненне сілы прымусу; апарат для падаўлення пануючым класам эксплуатататараў класа эксплуатуемых; арганізацыя грамадскага дагавора, якая выконвае свае функцыі ў інтарэсах усіх членаў пазначанага грамадства. У сучасным разуменні дзяржава ўяўляе сабой тэрытарыяльны, суверэнны саюз

грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды, маёмасці. Дзяржава з'яўляецца асноўным элементам палітычнай сістэмы, дзейнасць якой рэгламентуецца прававымі нормамі і правіламі маральных паводзін, выкананне іх забяспечваецца сістэмай кіравання і выхавання.

Беларускі народ сутыкнуўся з цяжкасцямі атрымання дзяржаўнасці ў сувязі з геапалітычным становішчам беларускіх зямель на карце Еўропы. Па словах А. Кавалені, акадэміка-сакратара Адзелу гуманітарных наук і мастацтваў НАН Беларусі "Мы, з аднаго боку, стаім на духоўным разломе, а з другога – на перакрыжаванні шляхоў з поўначы на поўдзень і з усхода на захад. Менавіта тут, як у кроплі вады адлюстроўвалася ўсё, што адбывалася на еўрапейскай прасторы. Складаны шлях прайшлі тысячы пакаленняў беларускага народу, але за ўсю гісторыю Беларусь ніколі не была каланіяльнай тэрыторыяй. Беларускі этнас заўжды выступаў как складовая частка дзяржаватворчага працэсу. Беларусы насуперак усім цяжкасцям захавалі сваю мову, культуру, традыцыі і атрымалі сваю дзяржаўнасць" [7].

Галоўнай ідэяй распрацаванага курса з'яўляецца тое, што дзяржава і дзяржаўнасць беларускага народа не была прынесена звонку, а з'явілася вынікам самастойнага палітычнага, культурнага і нацыянальнага развіцця людзей, якія пражывалі на гэтых тэрыторыях. Гэта асаблівая прыкмета, пэўны стан развіцця грамадства (нацыі, групы народнасцяў), якое здолела стварыць уласную палітычную адзінку, нацыянальную прававую сістэму або аднавіць гэтыя інстытуты, страчаныя ў сілу розных прычын.

Пытанне зараджэння дзяржаўнасці – гэта самае актуальнае пытанне для кожнага народа, гэта яго "Я", сэнс яго існавання і будучага развіцця. Глыбокае разуменне вытокаў паўстання незалежнай Рэспублікі Беларусь неабходны нашай краіне, нашаму этнасу, нашай моладзі. Гэтымі ведамі павінен валодаць кожны грамадзянін-патрыёт.

**Літаратура:**


1. Аргучинцев, Г. К. История государства и права Республики Беларусь: учеб. пособие для студ. спец. "Правоведение"/Г.К. Аргучинцев.- Минск: Амалфея, 2014.
2. Бохан Ю.М. Вайсковая справа ў Вялікім Княстве Літоўскім у ІІ палове XIV – XVIст. – Мн.: Беларуская навука, 2008.
3. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / А. Ф. Вішнеўскі, І. У. Вішнеўская. Мінск : ТетраСистемс, 2000.
4. Гісторыя Беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. / М.У. Смяховіч; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; -- Мінск: Беларуская навука, 2012.
5. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: падручнік для студ. установ вышэйшай адукацыі па спец. "Правазнаўства", "Паліталогіі"/Т.І. Доўнар.- Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. -

6. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 1-2. / Н. В. Смехович [и др.];– Минск: Беларуская навука, 2018-2019.
7. Истоки нашей государственности. История белорусской государственности - науке и школе /www.sb.by/Электроный ресурс/ Дата доступа 30.04.2019.
8. Латышонак А. Нацыянальнасць – Беларус. – Беларускае гістарычнае таварыства, 2009.
9. Сташкевич Н. Формирование белорусской государственности // Беларуская думка. 2001. № 1–2. – С. 56-70.
10. Стрэнкоўскі С.П. Гарадское самакіраванне ў вялікакняжацкіх уладаннях заходняй часткі ВКЛ у XV – XVIII стст. Аўтарэф. дыс…. канд. гіст. навук. Мн. 1999.
11. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. – Мн. 1992.